УДК 655.11 (476) (043)

# ДЗЕЙНАСЦЬ ГАЛОЎНАГА ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ Л ІТ АР АТУ РЫ І ВЫДАВЕЦТВАЎ БССР (1922 - пач. 1941 гг.)

*А. В. СУМКО*
*(Беларускі дзяржаўны універсітэт, г. Минск)*

*Разгледжан працэс фарміравання і асаблівасці развіцця цэнзурпых органаў у БССР на працягу 1922- 1941 гг. Показана іхмесца і роля ў сістэме дзяржаўна-ідэалагічнага контролю.*

Адным з першых актаў савецкага ўрада быў дэкрэт аб друку, сутнасць якога зводзілася да забароны ўсіх апазіцыйных газет і ўстанаўлення кантролю над друкам [1]. Тэты дэкрэт вызначыў палітыку балынавікоў у адносінах да выдавецкай справы на шмат гадоў уперад. Пазней была створана адмысловая сістэма палітычнага і ідэалагічнага кантролю над друкаванай прадукцыяй, дзе цэнтральнае месца належала Галоўнаму ўпраўленню па справах літаратуры і выдавецтваў, якое аб'яднала ўсе існуючыя віды цэнзуры. 3 цягам часу яно пачало кантраляваць тэатральны рэпертуар, кінематограф, радыёвяшчанне і г.д., адным словам, усе сферы грамадскага жыцця, якія ўплывалі на светапогляд людзей.

Першае Галоўнае ўпраўленне было створана ў РСФСР пры Народным камісарыяце асветы 6 чэрвеня 1922 г. [2]. Затым аналагічныя ўстановы пачалі ўзнікаць ва ўсіх саюзных рэспубліках. У БССР Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў (Галоўлітбел) афіцыйна было створана 5 студзеня 1923 г. [2]. Але першыя пасяджэнні пачалі праводзіцца яшчэ ў лістападзе 1922 г., тады ж былі і зацверджаны штаты Галоўлітбела [3]. Згодна з палажэннем яго кіруючым органам быў прэзідыум, які ўзначальваў старшыня, прызначаемы калегіяй Наркамасветы, і два яго намеснікі - прадстаўнікі ад Дзяржаўнага палітычнага ўпраўлення (ДПУ) і ваеннага камісарыята. Прычым апошнія падпарадкоўваліся не толькі старшыні, але і адпаведным установам. У якасці дарадчага органа пры Галоўным упраўленні па справах літаратуры і выдавецтваў была арганізавана калегія знаўцаў і спецыялістаў па розных галінах ведаў, якія займаліся рэцэнзаваннем і давалі сваё абгрунтаванае заключэнне, але канчатковае рашэнне заставалася заўсёды за прэзідыумам Галоўліта. У склад калегіі ўваходзілі прадстаўнікі партыйных і савецкіх органаў, літаратуры, навукі, мастацтва, такія як А.В. Баліцкі, В.А. Багуцкі, У.М. Ігнатоўскі, М. Кудзелька, Я. Левін, У.І. Пічэта, З.Ф. Жылуновіч, С.М. Некрашэвіч і інш. [3].

У аснову працы Галоўлітбела былі пакладзены агульныя для Галоўлітаў усіх саюзных рэспублік правілы і патрабаванні. Так, забаранялася выпускаць і распаўсюджваць творы, якія змяшчалі агітацыю супраць Савецкай улады, утрымлівалі ваенныя тайны рэспублікі, узбуджалі нацыянальны і рэлігійны фанатызм, узрушалі грамадскую думку шляхам паведамлення памылковых звестак, а таксама тыя творы, якія мелі парнаграфічны характар. 3 першага погляду, нічога злачыннага дадзеныя пункты ў сябе не змяшчалі, бо кантроль за кнігавыдавецтвам, сродкамі масавай інфармацыі і відовішчамі неабходны, а ў разглядаемы перыяд быў уласцівы амаль кожнаму ўраду краін свету. Пагроза, зыходзячая ад Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў, заключалася менавіта ў «размытости» патрабаванняў, не было вызначана дакладных межаў паміж дазволеным і недазволеным. Усё залежыла ад густу цэнзараў, ад палітыкі партыі ў кожны дадзены момант.

У 20 - 30-я гады асноўнае месца ў працы Галоўлітбела займала цэнзура кнігавыдавецкай дзейнасці. Галоўлітбел ажыццяўляў папярэдні прагляд і далейшы кантроль усіх прызначаных да апублікавання твораў, даваў дазвол на існаванне літаграфій і выдавецтваў. На пасяджэннях прэзідыума Галоўлітбела зацвярджаліся спісы забароненых да продажу або распаўсюджвання кніг, распрацоўваліся абавязковыя для ўсіх выдавецтваў правілы і распараджэнні па справах друку, а таксама даваўся дазвол на права выдання як асобных твораў, так перыядычных і неперыядычных органаў друку. Спачатку пасяджэнні прэзідыума Галоўлітбела праводзіліся некалькі разоў у месяц. Так, за восень 1922 г. было праведзена 9, а за першую палову 1923 г. - 15 пасяджэнняў [4]. Трэба адзначыць, што пераважная частка забароненай да распаўсюджвання літаратуры і перыёдыкі ў першы год працы была замежнага паходжання або выдадзена да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Усе яны былі аднесены да антысавецкіх, шавіністычных, буржуазных твораў. Сітуацыя змянілася ў 1924 г., калі беларусізацыя выклікала выдавецкі бум нацыянальных твораў. Імі і пачаў займацца Галоўлітбел. Прычым, цэнзурныя абмежаванні былі вельмі нязначныя. Многія творы, якія ў 30-я гады будуць далучаны да спіску забароненых кніг, у 20-я прызнаваліся бясшкоднымі. Тэта кнігі М. Гарэцкага, А. Гаруна, У. Дубоўкі, М. Зарэцкага, У. Пічэты, В. Ластоўскага, 3. Жылуновіча і інш. Кнігі, якія выклікалі незадавальненне прэзідыума Галоўлітбела адпраўляліся на дапрацоўку або да іх прымяняліся эканамічныя санкныі: кошт штучна завышаўся, а тыраж зніжаўся да

мінімума. У выніку такога памяркоўнага стаўлення працэнт забароненай літаратуры быў нязначным. Тэта было выклікана тым, што захоўваліся дэмакратычныя пачаткі, заваяваныя рэвалюцыяй, а жорсткі татальны кантроль яшчэ не паспеў пранікнуць ва ўсе сферы жыцця.

Галоўлітбел аднačасова ажыццяўляў палітычную і ваенную цэнзуру. Выданні ЦБ КП(б)Б вызваляліся ад палітычнай цэнзуры, але траплялі пад ваенную [5]. Апошняя ажыццяўлялася пры супрацоўніцтве Галоўнага ўпраўлення па справах літаратуры і выдавецтваў з аддзяленнямі ваенкаматаў, якія ведалі аператыўнай часткай [6]. Тэта давала магчымасць заўсёды валодаць інфармацыяй пра ваеннае становішча краіны і «правільна» вырашаць пытанні ваеннай цэнзуры. Зыходзячы з ваенна-стратэгічных матываў забаранялася друкаваць не толькі інфармацыю аб назвах прадпрыемстваў і аб’ёме вытворчасці, колькасці працоўных і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала, але і тыя, з якіх можна выбраць вышэйадзначаныя звесткі шляхам лагічных разважанняў і супрацьпастаўленняў [7].

Цэнзура распаўсюджвалася і на замежныя выданні, якія ўвозіліся ў Савецкі Саюз, і, адпаведна, у Беларусь. Трэба адзначыць, што Галоўлітбел карыстаўся пэўнай самастойнасцю ў вызначэнні ступені прыдатнасці для распаўсюджвання толькі той літаратуры, што выходзіла непасрэдна ў БССР. У адносінах да замежных выданняў ён кіраваўся выключна інструкцыямі Галоўліта РСФСР, у межах якога быў створаны спецыяльны аддзел, які займаўся замежнымі выданнямі і складаў адпаведныя спісы забароненай для ўвоза і распаўсюджвання літаратуры. Напрыклад, у 1923 г. такі спіс налічваў 232 кнігі [8]. Сярод іх былі творы М. Цвятаевай, М. Гумялёва, І. Бродскага, І. Севераніна, К. Набокава, А. Амфітэатрава і інш. Трапілі сюды і кнігі замежных аўтараў, такіх як Г. Уэльса «Россия во мгле», Дж. Бакача «Дэкамерон», казкі братоў Грым, а таксама творы Дж. Байрана [8].

Пасля зацвярджэння пастановы аб Галоўным упраўленні па справах літаратуры і выдавецтваў БССР адбылася праверка бібліятэк, кніжных крамаў, друкарняў і перарэгістрацыя ўсіх кнігавыдавецтваў. Уважліва прааналізаваўшы рэдакцыйна-выдавецкія планы Дзяржвыдавецтва Беларусі, Галоўлітбел застаўся незадаволеным. У віну выдавецтву было пастаўлена тое, што яно захапілася выпускам філасофскай літаратуры і белетрыстыкі, у той час калі трэба было звярнуць увагу ў першую чаргу на палітычную, марксісцкую літаратуру. Мабыць, да непатрэбнай белетрыстыкі адносілі творы В. Дуніна-Марцінкевіча, З. Бядулі, М. Доўнар-Запольскага і інш., якімі былі насычаны выдавецкія планы таго часу.

Нягледзячы на тое, што Галоўлітбел знаходзіўся ў сістэме Наркамасветы, ён цалкам падпарадкоўваўся ЦК КП(б)Б. Ніводнае пытанне нельга было вырашыць без папярэдняга ўзгаднення з аддзелам друку ЦК КП(б)Б, прадстаўнік якога ўваходзіў у склад калегіі Галоўлітбела [9]. Штомесяц у аддзел друку дасылаліся звесткі пра выкрэсліванні, зробленыя супрацоўнікамі Галоўлітбела, прычым прыводзілася аргументацыя дзеянняў цэнзараў [10]. Указанні і рэкамендацыі аб тым, якая літаратура з’яўляецца патрэбнай, і наадварот, галоўным чынам ішлі ад партыйных органаў і Галоўліта РСФСР - цэнзары ў сваёй працы карысталіся менавіта імі.

Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў мела структуру, адпаведную іншым дзяржаўным установам таго часу. Так, ва ўсіх абласных, акружных і раённых цэнтрах дзейнічалі мясцовыя «літы» са сваім штатам. Яны неслі адказнасць перад Галоўлітам і прадастаўлялі два разы ў месяц справаздачы. Абласныя «літы» ў сваю чаргу арганізоўвалі губернскія органы на месцах (губліты). У дапамогу Галоўнаму ўпраўленню, гублітам была створана спецыяльная трупа павятовых інспектараў, якія ажыццяўлялі кантроль над органамі друку, кніжным рынкам у паветах і падвяргалі папярэдняму прагляду друкаваны матэрыял [10]. Інспектар меў права часова прыпыніць выпуск выданняў, за выключэннем партыйных (канчатковае рашэнне аб забароне належала губліту).

Галоўліт Беларусі, у адрозненне ад аналагічных устаноў іншых савецкіх рэспублік, спачатку меў слаба разгалінаваную структуру. Тэта было абумоўлена тым, што да 1924 г. БССР уключала толькі 6 паветаў былой Мінскай губерні і Галоўлітбел функцыянаваў у межах дадзенай тэрыторыі. Кантролем над выдавецкай справай на беларускіх тэрыторыях, якія ўваходзілі ў склад РСФСР, займалася абласное ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў Заходняй вобласці РСФСР [11]. Толькі пасля ўзбуйнення Беларусі ў 1924 і 1926 гг. Віцебскі і Гомельскі губліты былі ліквідаваны, а ўсе справы па ажыццяўленню палітычнага і ідэалагічнага кантролю на гэтай тэрыторыі перайшлі непасрэдна да ўпаўнаважанага Г алоўліта Беларусі.

З цягам часу дзейнасць Галоўліта ўдасканальвалася. Былі распрацаваны два асноўныя шляхі цэнзурнага ўплыву. Першы шлях - гэта адміністрацыйнае і судовае праследаванне, якое выяўлялася ў закрыцці выдавецтваў, скарачэнні тыража, накладанні штрафа і нясенні судовай адказнасці. Другі шлях - умелы ідэалагічны ўплыў на рэдакцыі праз перамовы, увядзенне адпаведных работнікаў у іх склад і ліквідацыя найболып непрымальных.

Органы Галоўліта ўважліва сачылі за дзяржаўнымі, прыватнымі, кааператыўнымі, прафсаюзнымі, ведамаснымі і іншымі выдавецтвамі. Збіралі падрабязныя звесткі пра характар і праграму, асабісты склад

упраўлення, сувязі з грамадскімі і партыйнымі групоўкамі як у Беларусі, так і за мяжой. Акрамя гэтага, Галоўлітбел пільна сачыў за дзеячамі друку БССР, вывучаў іх стыль, манеру пісьма - усё тэта на прадмет усведамлення адпаведнасці таго ці іншага работніка друку патрабаванням рабоча-сялянскага чытача.

«Год вялікага пералому» стаў той мяжой, якая аддзяляла ўчарашні Саюз Савецкіх Рэспублік, з яго яшчэ неакрэсленымі ідэалагічнымі формамі, з развіваючай сістэмай тэрору, ад краіны, дзе ўсё тэта набыло сваё лагічнае завяршэнне, і тым самым законсервавала яе ад усялякіх зменаў на доўгія гады. Ад краіны дзе жорсткасць, фанатызм і здрада сталі нормай жыцця, а асоба была нізведзена да ролі шрубкі ў механізму. У 1931 г. на хвалі барацьбы з нацэмамі выйшла новае палажэнне пра Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў пры Народным Камісарыяце Асветы БССР, якое скасоўвала папярэдняе палажэнне ад 1923 г. Акрамя ажыццяўлення ўсіх відаў кантролю на яго ўскладалася арганізацыйнае і ідэалагічнае кіраванне літаратурнымі аб’яднаннямі, асацыяцыямі і гурткамі, а таксама распрацоўка разам з іншымі ведамствамі пералікаў звестак, якія па свайму змесху з’яўляліся дзяржаўнай тайнай і павінны былі спецыяльна ахоўвацца [12]. Быў цалкам рэарганізаваны цэнтральны апарат Галоўліта БССР, з яго склада вылучылі тры трупы па кантролю: за палітыка-эканамічнай літаратурай; за мастацкай, дзіцячай, педагагічнай і літаратурай па пытаннях культбудаўніцтва; за ўсімі выданнямі з пункту гледжання захавання ў іх дзяржаўных тайнаў [13]. Кожную трупу ўначальваў інспектар, які ў сваёй рабоце кіраваўся зацверджаным планам. Акрамя гэтага пры кожнай з першых дзвюх труп трэба было падабраць пяць пазаштатных палітрэдактараў. У абавязкі кіраўнікоў труп уваходзіла напісанне рэцэнзій па пэўнай галіне літаратуры, а затым размяшчэнне іх ў газетах і часопісах. Начальнік Галоўлітбела, апрача кіраўніцтва ўсёй дзейнасцю, займаўся арганізацыяй партыйна-рабочай і партыйна-навуковай грамадкасці вакол работы Галоўліта БССР і яго органаў. Арганізатарамі папярэдняга палітыка-ідэалагічнага кантролю над усімі выданнямі на месцах і адначасова наменікамі ўпаўнаважанага Галоўлітбела з’яўляліся асобнаўпаўнаважаныя [14].

Была распрацавана своеасаблівая сістэма прагляду друкаванага матэрыялу, у адпаведнасці з якой, толькі ў выпадку, калі матэрыял тычыўся абароны краіны або насіў характар афіцыйных урадавых дакументаў, апублікаванне якіх магло прама або ўскосна адносіцца да пытанняў эканамічна-палітычных адносін Савецкага Саюза з замежнымі краінамі і г.д., асобнаўпаўнаважаны праглядаў непасрэдна сам як з пункту гледжання захаванасці ў іх дзяржаўных тайн, так і з боку ідэалагічнай вытрыманасці і нёс за тэта поўную адказнасць. У выключных выпадках пасля ўласнага прагляду ён дасылаў матэрыял спецыялісту для водзыва. Ва ўсіх астатніх рукапісы для паліткантроля да ўпаўнаважанага паступалі толькі пасля ўхвалення да друку штатнымі або пазаштатнымі палітрэдактарамі выдавецтваў. Строга сачылася за тым, каб палітрэдактары і асобнаўпаўнаважаныя не мелі ніякіх адносін з аўтарамі рэцэнзуемых твораў. Усе неабходныя папраўкі рабіліся праз загадчыка сектара таго ці іншага выдавецтва.

У сваіх ацэнках той ці іншай кніжкі супрацоўнікі Галоўлітбела павінны былі быць вельмі асцярожнымі, бо неслі прямую адказнасць перад судом і адпаведнымі партыйнымі органамі за пропуск да друку антысавецкіх твораў і выданняў, а таксама за апублікаванне сакрэтных звестак. Разгортванне рэпрэсіўнага механізму, частыя пакаранні прывялі да таго, што цэнзары пачалі перастрахоўвацца. Гэта набыло значныя памеры. Быў выдадзены нават спецыяльны загад, які папярэджваў аб тым, што «незаконное вычеркивание сведений, не представляющих государственную тайну, затрудняет работу редакций и наносит политический ущерб стране» [15].

Пад уплывам грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных змен у жыцці грамадства ў пачатку 30-х гадоў, а менавіта з фабрыкаваннем справы «Саюза вызвалення Беларусі» і разгромам так званага нацыянал-дэмакратызму, адбылася праверка амаль усёй літаратуры, выдадзенай да 1930 г. у БССР [16]. Пад час якой органы Галоўлітбела разам з ДПУ правялі беспрэцэндэнтную па сваім маштабе чыстку беларускага кніжнага рынку. Былі перагледжаны і канфіскаваны як контррэвалюцыйныя, амаль усе падручнікі па гісторыіі Беларусі, геаграфіі, мове для агульнаадукацыйнай школы, такія як «Псторыя Беларусі» У. Ігнатоўскага, «Пачатковая геаграфія» М. Грамыкі, «Кароткі курс геаграфіі» А. Смоліча, усе выданні падручнікаў па беларускай мове Я. Лёсіка і інш. Быццам бы раскрыццё праблем у іх насіла «ідэалагічна неправільны» характар. Напрыклад, у адзначанай працы У. Ігнатоўскага меліся.такія недахопы, як ідэалізацыя буржуазных партый і нашаніўскага перыяду; меркаванне, што бальшавізм на Беларусі з’ява нанасная, цалкам руская і што беларускія нацыянальныя арганізацыі самі з’яўляліся насьбітамі балынавіцкіх ідэй. Важкім абвінавачваннем было тое, што акцэнт рабіўся не на класавай барацьбе, не на будаўніцтве сацыялізма ў СССР, а на адлюстраванні своеасаблівага гістарычнага развіцця Беларусь

Адпаведна такі ж падыход назіраўся і ў адносінах да мастацкай літаратуры. Вялася барацьба з кнігамі, прасякнутымі «адраджэнскай» ідэяй. У адносінах да крытычнай літаратуры Галоўлітбел канфіскоўваў творы, якія нягледзячы на сваю слушнасць, не супадалі з афіцыйнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі. Гэта датычылася, напрыклад, кнігі «На літаратурныя тэмы» М. Байкова, у якой культывіраваліся

погляды, што ў Беларусі немагчыма развіццё пралетарскай фабрычнай паэзіі, бо эканоміка носіць аграрнии характар, і таму беларуская літаратура і далей не страціць сваёй сялянскай накіраванасці [17]. Крытыкам трэба было вельмі асцярожна выказваць свае меркаванні.

Што тычыцца сельскагаспадарчай літаратуры, то знішчаліся творы, якія прапагандавалі і абгрунтоўвалі палітыку З.Ф. Прышчэпава, выступалі за ўкараненне хутарызацыі.

Палітычна-масавая літаратура актыўна ачышчалася ад твораў, у якіх не выкарыстоўваўся класавы падыход, ігнаравалася роля бальнавіцкай партыі, як «правадыра міжнароднага пралетарыята», якія так або інакш не ладзялялі савецкай традыцыі. Ім навешвалася кляймо «трацкісцкай кантрабанды». Пасля гэтай чысткі падобныя аперацыі праводзіліся сістэматычна. Складаліся вялізныя спісы забароненай да распаўсюджвання літаратуры, на аснове якіх і дзейнічалі органы Галоўлітбела і ДПУ.

З узмацненнем ідэалагічнага кантролю над кнігавыдавецкай прадукцыяй, асабліва пасля таго як у сакавіку 1934 г. выйшла Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Аб узмацненні даяржтайн у друку», вельмі востра паўстала пытанне кадравага забеспячэння Галоўлітбела, асабліва што датычылася абл/гор/райлітаў [18]. Матывіруя тым, што ўпаўнаважаныя Галоўлітбела мелі доступ да сакрэтных дакументаў, адбор прэтэндэнтаў на пасаду цэнзараў стаў вельмі сур'ёзны. Кандыдатуры зацвярджаліся толькі на пасяджэннях ЦК КП(б)Б. Улічвалася ўсё без выключэння: здольнасці, паходжанне, палітычныя погляды як непасрэдна кандыдатуры, так і яго сям'і. Напрыклад, у 1936 г. з пасады цэнзара Клічаўскага раёна быў зняты т. Скребунас, які нарадзіўся ў Латвіі і меў за мяжой сваякоў [19].

У 1936 г. рэдакцыі і выдавецтвы БССР, а следам і Галоўлітбел закранула модная хваля рэпрэсій, у выніку чаго гэтыя ўстановы пачалі адчуваць востры недахоп кваліфікаваных кадраў. Пасля чысткі не хапала прыкладна 70 кіруючых работнікаў друку, а ў Галоўлітбеле з 12 чалавек засталося толькі 2 [20]. На нейкі час ён амаль перастаў функцыянаваць, бо адразу некім было замяніць знятых з пасады цэнзараў і палітрэдактараў. Зразумела, што такое становішча не магло застацца без увагі як з боку ЦК КП(б)Б, так і ЦК УКП(б). Пытанне неўкамплектаванасці партыйных газетна-выдавецкіх кадраў і Галоўлітбела ў межах БССР было вырашана за кошт камандзіроўкі з розных гарадоў СССР 20 кваліфікаваных работнікаў газетна-выдавецкага сектара [21].

Так як Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў БССР выконвала важную ідэалагічную функцию, то адначасова з нарошчваннем маштабаў рэпрэсій, ўзмацненнем рэпрэсіўнага механізму, разрастаўся апарат Галоўлітбела і пашыралася поле яго дзейнасці. Ажыццяўленне дзяржаўнага кантроля над друкам набыло асабліва вялікае значэнне ў перадваенны час. Разглашэнне любых звестак эканамічнага і абарончага характара прыраўноўвалася да здрады Радзіме. Быў створаны спецыяльны аддзел ваеннай цэнзуры (АВЦ), які займаўся ажыццяўленнем далейшага кантроля над усёй друкаванай прадукцыяй БССР наконт утрымання ў ёй дзяржаўных ваенна-эканамічных тайнаў. Ва ўмовах памежнай рэспублікі, дзе знаходзілася вялікая колькасць вайсковых частак, а таксама разгортвалася будаўніцтва стратэгічна-важных аб'ектаў, праца АВЦ БССР, з пункту гледжання ЦК КП(б)Б, набыла першачарговае значэнне. Менавіта на гэты аддзел у жніўні 1938 г. былі ўскладзены абавязкі падрыхтоўкі перахода цэнзуры з мірнага часу на ваенны [22]. Асноўную ролю ў адносінах да кнігавыдавецкай дзейнасці пачалі адыгрываць рэпрэсіўныя мерапрыемствы.

У другой палове 1930-х гадоў шмат увагі Галоўлітбел удзяляў абласным органам цэнзуры. Адбываліся сістэматычныя праверкі аблітаў і райлітаў, у выніку якіх выявілася, што справа па ажыццяўленню ідэалагічнага кантролю на месцах носіць досыць фармальны характар. Былі выпадкі, што на пасаду цэнзара прызначалі чалавека, якога нават не было ў межах БССР [23]. Мясцовыя абкомы партыі перавагу аддавалі іншым справам, з-за недахопу адказных работнікаў у раёнах цэнзары вельмі часта выкарыстоўвалі іх не па прамому прызначэнню (пасылаліся на палітычныя сельскагаспадарчыя кампаніі, перамяшчаліся на іншыя пасады).

Да 1941 г. пад націскам з боку Галоўлітбела і цэнтральных партыйных органаў сітуацыя змянілася. Было наладжана бесперапыннае ажыццяўленне папярэдняй і далейшай цэнзуры як у цэнтры рэспублікі, так і ў раёнах. Былі амаль цалкам укамплектаваны штаты і створаны ўмовы для ажыццяўлення палітыка-ідэалагічнага і ваеннага кантролю над выдавецкай дзейнасцю.

Да пачатку вайны сістэма партыйна-ўрадавага кантролю за ўсімі сферамі грамадскага жыцця, у першую чаргу за кнігавыдавецкай дзейнасцю, цалкам сфарміравалася; склалася цэнзурная сістэма, заканадаўства ў сферы кнігавыдавецтва, тэта значыць увесь механізм кантролю і падаўлення нацыянальнай адметнасці ў дадзенай галіне. Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў БССР выконвала ў гэтай сістэме выканаўча-распарадчыя функцыі. На працягу 20 - 30-х гадоў удасканальваліся яго метады, укамплектоўваўся апарат і цалкам аформіліся накірункі працы. Нягледзячы на тое, што Галоўлітбел быў дзяржаўным органам і знаходзіўся ў агульных арганізацыйных рамках Наркамасветы, ён перш-наперш з'яўляўся самастойнай палітычнай установай. Усё рэгламентавалася ў залежнасці ад

палітыкі партыі, усе перыядычныя і неперыядычныя органы друку знаходзіліся пад жорсткім ідэалагічным кантролем, які ажыццяўляла ў першую чаргу Галоўнае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў БССР пад пільным наглядам ЦК КП(б).

## ЛІТАРАТУРА


1. Декреты Советской власти. Т. I. - М, 1957. - С. 24.
2. Исключить всякие упоминания... - Мн., 1995. - С. 20.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф, 42, воп. 1., спр. 209, л.16.
4. Протько Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917 - 1941 гг.). - Мн., 2002. - С. 225; НАРБ. Ф. 42, воп. 1, спр. 214, л. 2 - 26.
5. Ракашевич В.К. Главлит БССР (1923 - 1991) // Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып.1. - Мн., 2000.-С. 178.
6. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 246. Воп. 1. Спр. 316. - Л. 44.
7. Там жа. Спр. 318. Л.140.
8. Там жа. Л. 25.
9. Лукашук А. За кіпучай чэкісцкай работай. - Мн., 1997. - С. 95.
10. ДАВВ. Ф. 170. Воп. 1. Спр. 433. Л. 25.
11. Там жа. Спр. 316. Л. 42.
12. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). Ф. 326. Воп. 1. Спр. 76. Л. 87.
13. Там жа. Л. 80.
14. Там жа. Л. 81.
15. НАРБ. Ф. 4. Воп. 14. Спр. 2422. Л.19.
16. Там жа. Спр. 110. Л. 258.
17. Там жа. Л. 279 - 280.
18. Там жа. Воп. 21. Спр. 461. Л. 410.
19. Там жа. Спр. 1058. Л. 166.
20. Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусь - Мн,, 2000. - С.126. НАРБ. Ф.4.Воп. 21. Спр. 884. Л. 18.
21. Касцюк М. Бальшавіцкая сістэма ўлады на Беларусь С. 126.
22. НАРБ. Ф. 4. Воп. 21. Спр. 1653. Л. 1.
23. Там жа.Спр. 1379. Л. 48.